ДУК “НАВАГРУДСКАЯ РАЁННАЯ БІБЛІЯТЭКА”
АДДЗЕЛ БІБЛІЯТЭЧНАГА МАРКЕТЫНГУ

# КРАЯЗНАЎЧЫ КАЛЯНДАР ЗНАМЯНАЛЬНЫХ І ПАМЯТНЫХ ДАТ НАВАГРУДЧЫНЫ

## на 2023 год



2022

## У 2023 годзе спаўняецца:

**800** гадоў (1223г.) з дня нараджэння Войшалка, сына Міндоўга, князя навагародскага, вялікага князя ВКЛ.
**770** гадоў (1253г.) з часу каранацыі вялікага князя Міндоўга на караля Літвы.
**765** гадоў (1258г.) з часу нападзенне на Навагрудак мангола-татар.
**765** гадоў назад (1258г.) Войшалк і полацкі князь Тауцівіл выганяюць з Наваградка Рамана Галіцкага.
**765** гадоў назад (1258г.)сын Міндоўга Войшалк стаў князем Навагрудка.
**760** гадоў назад (1263г.) княжанне ў Вялікім княстве Тройната.
**745** гадоў назад (1278г.) Навагрудак быў разбураны войскамі Галіцка-валынскага княства ў саюзе з мангола-татарамі, чым, фактычна, завяршылася гісторыя старажытнага Навагрудка.
**730** гадоў назад (1293-1316 гг)-княжанне ў Навагрудку і ВКЛ Віценя.
**700** гадоў назад (1323г.) ўпамінаецца аб існаванні ў Навагрудку манастыра францысканцаў.
**700** гадоў назад (1323г.) вялікі князь Гедымін перанёс сталіцу дзяржавы ў Вільню.
**615** гадоў назад (1408г.) адбылася Тайная сустрэча ў Навагрудку вялікага князя Вітаўта і караля Польшчы Ягайлы для абмеркавання падрыхтоўкі рашаючай бітвы з крыжакамі.
**595** гадоў назад (1428г.) выдадзена Грамата вялікага князя Вітаўта, аб перадачы Навагрудка ў пажыццёвае ўладанне жонцы Юльяне.
**595** гадоў назад (1428г.) (у згаданай грамаце Вітаўта) упершаню ў дакументах упамінаюцца вёскі Асташына, Басіна, Брацянка, Гарадзечна, Дзяляцічы, Кубарка, Нягневічы, Поўбераг.
**590** гадоў (1433г.) з часу пабудовы Уселюбскага Крыжаўзвіжанскага касцёлу, памніка гатычнай архітэктуры.
**590** гадоў (1433г.) часу першага ўпамінання ў дакументах в. Уселюб.
**575** гадоў назад (1448г.) у Навагрудку прайшоў сейм Вялікага княства Літоўскага.
**535** гадоў (1488г.) з часу першага ўпамінання ў дакументах в.Шчорсы.
**515** гадоў назад (1508г.) у Навагрудку адбыўся сейм Вялікага княства Літоўскага.
**455** гадоў назад (1568г.) у Навагрудку налічвалася 10 праваслаўных цэркваў (Барысаглебская, Іаанаўская, Крыжаўзвіжанская, Мікалаеўская, Пакроўская, Параскева-Пятніцкая, Сімеонаўская, Троіцкая, Уваскрасенская, Успенская)
**450** гадоў з дня нараджэння (1573 ці 1574г. Навагрудчына - 1637) – Руцкага Іосіфа Вельяміна (ва ўніяцкай гістарыяграфіі Іосіф IV; свецкае Іван Феліксавіч), пісьменніка-палеміста, царкоўна-палітычнага дзеяча ВКЛ, уніяцкага метрапаліта.

**435** гадоў назад (1588г.) прыняты III Статут Вялікага княства Літоўскага
**425** гадоў назад (1598г.) - Грамата Жыгімонта III аб дазволе навагрудскаму ваяводзе збіраць з гараджан па 50 залатых для брукавання вуліц горада.
**420** гадоў назад (1603 г). у Навагрудку адбылася эпідэмія.
**410** гадоў назад (1613 г.) — Прывілеем вялікага князя замкавыя мяшчане Навагрудка падводзіліся пад Магдэбургскае права.
**410** гадоў назад (1613 г.) — уніяцкім мітрапалітам стаў Іосіф (па нараджэнню Ян) Вельямін Руцкі, ураджэнец в. Рутка пад г. Навагрудкам.
**410** гадоў назад (1613 г., сакавік) — Прывілей вялікага князя з дазволам адкрыць у Навагрудку і іншых гарадах бызыліянскія школы з навучаннем на роднай мове.
**410** гадоў назад (22 кастрычніка 1613 г.)- Вялікі пажар у Навагрудку. У выніку пажара знішчана большая частка горада.
**405** гадоў назад (1618 г.) - у Навагрудку быў зачынены кальвінісцкі храм.
**400** гадоў назад (1623 г.) - Яўрэі Навагрудка былі ўключаны пад уладу Брэсцкага кагала.
**395** гадоў назад (1628 г.) - пры Барысаглебскай царкве заснаваны базыліянскі мужчынскі манастыр.
**390** гадоў назад (1633 г.) - Грамата вялікага князя і караля Уладзіслава аб вяртанні ў гарадах, у т. л. і ў Навагрудку, праваслаўным ад уніятаў па адной царкве.
**325** гадоў з дня нараджэння (1698, в.Шчорсы Навагрудскага р-на -1766) Храптовіча Марцыяна, дзяржаўнага дзеяча ВКЛ, старосты вярбельскага.
**315** гадоў назад (1708 г.) — эпідэмія ў Навагрудку, падчас якой загінула амаль палова жыхароў.
**305** гадоў з дня нараджэння (1718, Навагрудчына – 1760) Саламеі Рэгіны Іахімаўны Пільштынавай (Русецкай), асветніцы, мемуарысткі, падарожніцы, лекаркі.
**300** гадоў (1723 г.) з часу завяршэння будаўніцтва і асвячэння Фарнага касцёла, у выніку часу ён набыў сучасны выгляд.
**295** гадоў з дня нараджэння (1728 – 1814) Юзафа Несялоўскага, дзяржаўнага і палітычнага дзеяча ВКЛ. У 1765г. – падкаморы навагрудскі. У 1765-1773 – кашталян навагрудскі. З 1773г. – ваявода навагрудскі.
**255** гадоў назад (1768г.) пабудавана царква ў в. Лаўрышава.
**250** гадоў назад (1773 г.) - пабудавана царква ў в.Ятра.
**225** гадоў з дня нараджэння (каля 1798, Навагрудчына – 1873), Ігната Яцкоўскага, беларускага і польскага пісьменніка, мемуарыста, удзельніка паўстання 1830-1831гг. Працаваў адвакатам у Навагрудку.
**215** гадоў з дня нараджэння (1808, в. Валеўка – 1877) Антона Восіпавіча Мухлінскага, рускага і беларускага вучонага-арыенталіста, усходазнаўца, педагога, члена-карэспандэнта Расійскай акадэміі навук, прафесара.

**200** гадоў газад (1823 — 1824 г.г.) рамонт будынка гарадской Ратушы.
**180** гадоў назад (1843 г.) Навагрудак уключаны ў склад Мінскай губерні.
**175** гадоў назад (1848г.) пабудавана графам О'Руркам царква ў в.Уселюб.
**165** гадоў назад (1858г.-1868) адкрылася Навагрудская сямікласная гімназія.
**160** гадоў назад (1863-1864 г.г.) удзел навагрудчан у паўстанні.
**160** гадоў назад (1863 г., 7. 04) бой паўстанцкага атрада з царскімі войскамі ля вёскі Налібакі.
**135** гадоў назад (1888 г.) у Навагрудку пачаў дзейнічаць банк.
**125** гадоў назад (1898 г.) пачатак дзейнасці тыпалітаграфіі Данцыга
**120** гадоў назад (1903 г). - у касцёле св. Міхаіла стараннем дачкі А. Міцкевіча Марыі Гарэцкай установлена мемарыяльная пліта ў гонар 100-годдзя з дня нараджэння паэта.
**110** гадоў назад (1913 г.) на базе гарадскога вучылішча заснавана вышэйшае пачатковае вучылішча. Пры ім – педагагічныя курсы.
**100** гадоў з дня нараджэння (1923г.) П.П.Каўцэвіча. мастака, уражэнца г.п.Любча.
**70** гадоў назад (1953 г.) пабудаваны піваварны завод на базе воцатнага цэха райхарчкамбіната.
**65** гадоў назад (1958 г.) пачаў працаваць Навагрудскі сельскагаспадарчы тэхнікум.
**65** гадоў назад (1958 г.) закрыта Навагрудскае медыцынскае вучылішча і Навагрудскае педагагічнае вучылішча.

## ✧ СТУДЗЕНЬ ✧

**2** – 95 гадоў з дня нараджэння **Мацкевіча Баляслава Іосіфавіча** (нар. у 1928 г., в.Гнесічы Навагрудскага раёна), беларускага вучонага ў галіне хірургіі, доктара медыцынскіх навук, прафесара, выдатніка аховы здароўя. У 1962–2000 гг. працаваў у Гродзенскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце.
**11** – 60 гадоў з дня нараджэння **Гайба Мікалая Паўлавіча** (1963, в.Вялікія Вераб'евічы Навагрудскага раёна), гісторыка, краязнаўцы, музеязнаўца, навуковага супрацоўніка дома-музея Адама Міцкевіча.
**13** – 115 гадоў з дня нараджэння **Мальца Івана Васільевіча** (1908, в.Мольнічы Навагрудскага раёна – 2000), беларускага грамадскага і культурнага дзеяча, дзеяча рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, заслужанага настаўніка Беларусі.

## ✧ ЛЮТЫ ✧

**2** – 80 гадоў з дня нараджэння **Будзько Антаніны Піліпаўны** (нар. у 1943 г., в.Альхоўка Навагрудскага раёна), беларускага мовазнаўцы, педагога.

**14** – 65гадоў з дня нараджэння **Бурлыкі Івана Рыгоравіча**(нар. у 1958 г., в.Гаравічы Навагрудскага раёна), беларускага мовазнаўца, перакладчыка, педагога. З 1995 г. працаваў у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я.Купалы.

**26** – 65 гадоў з дня нараджэння **Бусько Івана Іванавіча** ( нар.у1958 г. у в. Басіна Навагрудскага раёна), беларускага вучонага ў галіне бульбаводства.

## ✧ САКАВІК ✧

**2** – 45 гадоў з дня нараджэння **Зміцера Арцюха** (1978 г. в. Рутка Навагрудскага раёна) беларускага паэта, журналіста, заснавальніка Паэтычнага тэатра «Арт. С» (разам з Аксанай Спрынчан), члена Саюза пісьменнікаў Беларусі. Жыве ў Мінску.

**19 ці 25** – 255 гадоў з дня нараджэння **Храптовіча Адама** (1768, в.Шчорсы Навагрудскага раёна–1844), асветніка, мецэната, дзяржаўнага дзеяча, удзельніка паўстання 1794 г., ганаровага члена Віленскага ўніверсітэта. Адкрыў парафіяльную школу ў в.Нягневічы і школу ўзаемнага навучання ў в.Шчорсы на Навагрудчыне.

**30** – 135 гадоў з дня нараджэння **Яна Цеханоўскага** (1888, в. Якімаўка, Гомельшчына — 5 кастрычніка 1938, Ашмяны)— нацыянальнага дзеяча Заходняй Беларусі, педагога, працаваў дырэктарам Навагрудскай беларускай гімназіі (1921).

## ✧ КРАСАВІК ✧

**17** – 120 гадоў з дня нараджэння **Набокава Мікалая Дзімірыевіча** (1903, м. Любча, Навагрудскага раёна– 1978), амерыканскага кампазітара, педагога, музычнага грамадскага дзеяча рускага паходжання. У 1920 г. пераехаў у Францыю. З 1933 г. жыў у ЗША.

**18** – 185 гадоў з дня нарадэжэння **Дыбоўскага Уладзіслава** (1838, маёнтак Адамарын, Вілейскі павет, цяпер Валожынскі раён— 27 ліпеня 1910) — расійскі, беларускі і польскі заолаг, батанік, палеантолаг, мінералог і фальклырыст. Доктар мінералагічных навук (1878). Аказаў значны ўплыў на навуку Навагрудчыны, куды пераязджае ў 1878 годзе. Пахаваны ў в. Войнава (Навагрудскі раён).

**20** – 265гадоў з дня нараджэння **Булгака Іасафата** (свецк. Ігнацій; 1758, Слонімскі павет–1838), грэка-каталіцкага царкоўнага дзеяча, доктара тэалогіі. У 1763–1774 гг. вучыўся ў Жыровіцкай базыльянскай школе. Меў рэзідэнцыі ў Навагрудку і Жыровічах.

## ✧ МАЙ ✧

**3 -** 160 гадоў з дня нараджэння **Гаркавага Аляксандра** (1863 г., Навагрудак - 1939)– яўрэйскага мовазнаўца, пісьменніка, атрымаў на радзіме традыцыйнае рэлігійнае выхаванне.

**10 -** 65 гадоў з дня нараджэння **Васюкевіча Віктара Аляксандравіча** (1958 г. в.В.Карнышы Навагрудскага раёна), беларускага мастака.

**11** – 235 гадоў з дня нараджэння **Ачапоўскага Міхаіла Мікалаевіча** (1788, Навагрудчына – 1854), асветніка, вучонага-агранома, глебазнаўца.

**21** – 335 гадоў з дня нараджэння **Радзівіла Мікалая Фаўстына** (Мікалай Альбрыхт Ігнацы Пётр; 1688, Дзятлава – 1746), дзяржаўнага і ваеннага дзеяча ВКЛ, генерал-лейтэнанта. Ваявода навагрудскі з 1729 г. Валодаў мястэчкам Дзятлава ў Слонімскім павеце.

## ✧ ЧЭРВЕНЬ ✧

**9** – 295 гадоў з дня нараджэння **Рагоўскага Казіміра** (1728, Навагрудчына – 1810), тэолага, філосафа, педагога. Вучыўся ў Слонімскім езуіцкім калегіуме. У 1750-1755 гг. выкладаў у Навагрудскім езуіцкім калегіуме. У 1760-1761 гг. – прапаведнік у Слоніме.

## ✧ ЛІПЕНЬ ✧

**23 -** 70 гадоў з дня нараджэння **Мурзіч (Кокала) Люсі Іванаўны** (1953, в.Зенявічы Навагрудскага раёна), беларускага літаратуразнаўца, педагога.

**25** – 195 гадоў з дня нараджэння **Малышэўскага Івана Ігнатавіча** (1828, в.Нягневічы Навагрудскага раёна – 1897), асветніка, гісторыка царквы, пісьменніка, славяназнаўца. Вучыўся ў Жыровіцкім духоўным вучылішчы.

**31** – 110 гадоў з дня нараджэння **Петрыкевіча Міхаіла Фёдаравіча** (1913. в. Падкасоўе Навагрудскага раёна – 1999), беларускага педагога. Краязнаўца, музеезнаўца, Заслужанага настаўніка БССР, адзін з заснавальнікаў Валеўскага народнага гісторыка-краязнаўчага музея.

## ✧ ЖНІВЕНЬ ✧

**5** – 155 гадоў з дня нараджэння **Тураева Барыса Аляксандравіча** (1868, Навагрудак – 1920), гісторыка-усходазнаўца, заснавальніка расійскай школы гісторыі і філалогіі Старажытнага Усходу, акадэміка Расійскай АН.

**13** – 100 гадоў з дня нараджэння **Пярловіча Самсона Георгіевіча** (1923, в. Католышы, Навагрудскі раён. - 14.12.2001, Навагрудак) - паэта, удзельніка навагрудскага патрыятычнага падполля.

**22** – 85 гадоў з дня нараджэння **Міхея Мікалая Дзмітрыевіча** (нар. у 1938 г., в.Нянькава Навагрудскага раёна), беларускага мовазнаўца, педагога.

## ✧ ВЕРАСЕНЬ ✧

**11** – 85 гадоў з часу ўрачыстага адкрыцця Дома-музея імя Адама Міцкевіча ў Навагрудку (1938).

**13** – 80 гадоў з дня нараджэння **Кулакоўскай Любові Міхайлаўны** (1942 ці 1943г. в. Дзяляцічы Навагрудскага раёна), беларускага дзеяча самадзейнага мастацтва, педагога, заслужанага работніка культуры Беларусі.

**26 -** 80 гадоў з часу масавага пабегу яўрэяў з навагрудскага гета (1943).

## ✧ КАСТРЫЧНІК ✧

**13** – 135 гадоў з дня нараджэння **Драздовіча Язэпа Нарцызавіча** (1888 – 1954), беларускага мастака, скульптара, этнографа, фальклярыста, археолага, пісьменніка. У 1927-1930 гг. працаваў выкладчыкам малявання ў Навагрудскай гімназіі. Стварыў серыю графічных работ, прысвечаных Гродзеншчыне.

## ✧ ЛІСТАПАД ✧

**15** – 80 гадоў з дня нараджэння **Вербавай Хрысціны Уладзіміраўны** (нар. у 1943 г., в.Радагошча Навагрудскага раёна), беларускага педагога, псіхолага. З 1971 г. працуе ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я.Купалы.

## ✧ СНЕЖАНЬ ✧

**2** – 65 гадоў з дня нараджэння **Кошур Святланы Андрэеўны** (нар. у 1958 г., в.Валеўка Навагрудскага раёна), беларускага краязнаўца, пісьменніцы, музеязнаўца, лаўрэата прэміі імя А. Дубко Гродзенскага аблвыканкама "За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва" ў намінацыях "Музейны работнік года" (2002) і "Пісьменнік года" (2016).

**24** – 225 гадоў з дня нараджэння **Міцкевіча Адама** (1798, фальв. Завоссе Навагрудскага павета ці Навагрудак – 1855), паэта, публіцыста, грамадскага дзеяча, асветніка. У 1807-1815 гг. вучыўся ў Навагрудскай дамініканскай школе.

**27** – 105 гадоў (1918 г) - нямецкія войскі пакінулі Навагрудак. Уступленне ў горад 152-га стралковага палка Чырвонай Арміі. Пачатак устанаўлення савецкай улады на Навагрудчыне.

Складальнік: Н.В.Міселя
Набор і камп'ютарная вёрстка: Н.В.Міселя
Рэдактар: С.І.Івашкевіч
Надрукавана на абсталяванні Навагрудскай раённай бібліятэкі.
Наклад 15 асобнікаў. Ад 18.11.22